№ 3 (40) Вільня, сьнежень 1924 г. Цана асобнага нумару 10 грошау.

Рабочыя і сяляне усіх краёу, злучайцеся!

ЧЫРВОНЫ СЬЦЯГ

ОРГАН КАМУНІСТЫЧНАЕ ПАРТЫІ ЗАХОДНЕЙ БЕЛАРУСІ.

Няхай жыве злучаная Беларуская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка!

II КАНФЭРЭНЦЫЯ КАМПАРТЫІ ЗАХ. БЕЛАРУСІ.

У апошніх днях лістапада на тэрыторыі Зах. Беларусі адбылася II краёвая канфэрэнцыя К.П.З.Б. На канфэрэнцыі прадстаулены былі акругі: Віленскі, Горадненскі, Берасьцейскі, Пінскі, Беластоцкі і Барановіцкі. Апрача акружных прадстаунікоу і Ц.К. у нарадах прынялі учасьце прадстаунік С.К.М.З.Б. З дарадчым голасам, — Цантр. Рэдакцыя, Цантр. Жыд. Бюро, а такжа прадстаунік Ц.К.К.Р.П.П.

Парадак дня складауся: 1) Справаздача Ц.К., 2) Справаздача з V кангрэсу Камінтэрна, 3) Пытаньні тактыкі, 4) Выбары Ц.К., 5) Выбары дэлегатау на зьезд К.Р.П.П., 6) Арганізацыйныя справы і 7) Бягучыя справы.

Прыступаючы да разгляду справ, канфэрэнцыя выказала спачуцьцё і пашану т.т., замучаным праз паслугачау польскай буржуазеі, і выказала прывітаньне палітычным вязьням, якія перапауняюць казаматы астрогау на Зах. Беларусі і усей Польшчы.

Нарады канфэрэнцыі адбываліся у момант, калі рэвалюцыйны уздым сярод сялян узрастае з кожным днём, выліваючыся у розных местах у форме аддзельных аружных выступленьняу. Канфэрэнцыя прызнала, што на ёй ляжыць абавязак ахапленьня гэтага руху, уцягіваньне як найшырэйшых мас, — абавязак палітычнага і арганізацыйнага прыгатаваньня к масаваму збройнаму паустаньню.

Вынікі нарад канфэрэнцыі у рэзалюцыі „Аб формах revaлюцыйнай барацьбы у Зах. Беларусі" і „Аб злучэньню Зах. Беларусі з Беларускай Сав. Рэспублікай" даюць партыі выразную лінію тактыкі і будуць служыць вехамі і заахвочываць да інтэнсыунай працы перад тымі аграмаднымі заданьнямі, якія партыя сабе назначыла.

Справаздача дзеяльнасьці ЦК, закончаная прыняцьцям рэзалюцыі аб выніках працы і яе пахібах — яскрава сьведчыць аб узросьце партыйнай арганізацыі. Наша партыя крэпкім каранём урасла у сялянскія масы і ніякія рэпрэсыі ня змогуць яе разрушыць і парваць сувязь з масамі.

Апрача масавых арыштау, якія забралі у партыі у бягучым годзе шмат працаунікоу партыйных — арганізацыя партыйная лічыць у сучасны момант у 3 разы болей сяброу, як год таму назад. Партыйнае выдавецтва, як па ліку выданых рэчау, так і па тыражу — значна узрасло. Тады як у пэршым паугодзе г. г. 62 прац. агульнага ліку распаусюджаных выдауніцтв прыпадала у польскай мове, а на белар. і расейск. 31 прац., жыдоускай 7 прац., у апошнія 5 месяцау выдавецтва змагло даць у белар. і расейскай мовах 85 прац., польск. 10 парц. і жыдоускай 5 прац.

Значнага арганізацыйнага поступу дабілася партыя у час апошніх некулькіх месяцау. Вясковыя арганізацыі, якія ня былі арганічна зьвязаны з арганізацыямі гарадзкімі, цяпер аб'еднаны у акружн. канфэрэнцыі, якія выконываюць свае функцыі як кіраунікі акругоу, а ня толькі пасрэдніка па дастауцы літаратуры.

Цэлы шераг акцыі праведзеных у апонія часы, асабліва супроць белага тэрора і на угодкі Кастрычнікавай рэвалюцыі, выказалі вялікую актыунасьць вясковых арганізацый. Энэргічнае пашырэньне літературы і каля сотні чырвоных сьцягау вывешаных па вёсках, гарадох і нават у казармах каля ваенных гарнізонау, пасьля папыткі абароны гэтых сьцягау перад паліцыяй, усё добра сьведчыць аб нашай маладой вясковай арганізацыі.

Спэцыяльнае выдавецтва для жаунерау на польскай мове знайшло доступ да казармау, крэпасьцей, нават да паліцейскіх школ і камісарыятау.

Мы ёсьць і змагаемося! — гэта добра чуець польская буржуазея, чуюць гэта і сялянскія масы і ахвоча гуртуюцца каля нашых сьцягау.

Канфэр. выказала даволі значную зьнітованасьць, ня гледзючы на моладасьць арганізацыі і на тое, што шмат учаснікоу першы раз прыймалі удзел у так важных нарадах. Канфэрэнцыя у цэласьці выказала уразуменьне арганізацыйных і палітычных падстау бальшавізму і ёсьць значным шагам да бальшавізацыі нашай маладой аграмаднай пераважна сялянскай партыі.

Рэзалюцыя на справаздачу Ц.К.К.П.З.Б. II канф. 1924 г.

Выслухаушы справаздачу аб дзеяльнасьці Ц.К., II канфэрэнцыя пацьверждае:

За час ад I да II канфэрэнцыі адзначаецца выдатнае павялічэньне нашай партыйнай арганізацыі. Арганізаваны новыя акругі: Пінскі і Барановіцкі, а таксама значна павялічаны лік партыйных ячэяк па вёсках у акругах, існаваушых да гэтага часу. За гэты час павялічыуся лік сяброу нашай арганізацыі.

Гэта ставіць перад партыяй сур'ёзную задачу, як мага хутчэй ідэёва ахапіць і апрацаваць новапаступіушых у нашую партыю, што патрэбуе інтэнсыунай і пастаяннай прапагандыстычнай працы.

Стыхійна павялічываючыйся уплыу партыі, асабліва у вёсцы, высоуваець партыю на чале сялянскіх мас і прыдае ёй характар і абавязкі правадыра рэвалюцыйнага руху сялянства. Усё гэта прыводзе да таго, што кампартыя Зах. Беларусі становіцца сур'ёзным рэвалюцыйным і грамадзкім фактарам ня толькі у Зах. Беларусі, але і ува усей Польшчы.

Канфэрэнцыя пацьверждае, што апрача павялічэньня партыйнай арганізацыі і партыйнага уплыву — у працы мінулага пэрыяда зауважаны сур'ёзныя пастановы у вобласьці паглыбленьня камуністычнага руху. Узмоцнена выдавецкая чыннасьць, стараньні Ц.К. задаволіць патрэбы у літаратуры на беларускай, расейскай, польскай і жыдоускай мовах, а такжа аднауленьне партыйнага органу „Чырвоны Сьцаг" на беларускай мове сьведчыць аб тым, што Ц.К. зразумеу патрэбы партыі і у цяжкіх абставінах падпольнай працы, пры вялікіх труднасьцях з прычыны моладасьці арганізацыі і недахвату людзей—здалеу затратай працы іх задаволіць.

Канфэрэнцыя падчырківае, што Ц.К. зьвярнуу у апошні час належную увагу на работу у арміі і вітае агітацыйнае выданьне для войск.

Канфэрэнцыя з задаволеньнем падчырківае, што Ц. К. К.Р.П.П., разумеючы труднасьць маладой партыйнай арганізацыі у Зах. Беларусі, не маючай яшчэ удастатку палітычна і арганізацыйна выпрацованых працаунікоу, якую разбіваюць і дэзарганізуюць рэпрэсыі, зрабіу неабходную арганізацыйную помач, што дало магчымасьць, не перарываючы работы, перанясьці самы трудны час.

II канфэрэнцыя лічыць патрэбным зьвярнуць увагу новага Ц.К. на ніжэй пададзеныя важнейшыя задачы:

а) Зьвярнуць увагу на падшуканьне і апрацоуку адпаведных арганізатарау і адпаведнае абслугоувываньне акругоу.

б) Павялічэньне прапагандыстычнай і арганізацыйнай працы сярод сялянства праз павялічэньне выдавецкай працы.

в) Зьвярнуць сур'ёзную увагу на працу сярод гарадзкога пралетарыяту, асабліва чыгуначнікау.

г) Павялічыць працу у арміі.

д) Даваць больш помачы С.К.М., вцягнуушы яго в парт. работу.

ж) Наладзіць ізноу працу сярод жыдоускага жыхарства.

Канфэрэнцыя лічыць, што праца беларускага соймовага клюбу не крытыкавалася Ц.К. як гэта трэба было рабіць. З гэтае прычыны масы не маглі націскаць на паслоу і прымусіць іх вясьці палітыку, адпавядаючую настроям і інтарэсам працоуных Заходней Беларусі.

Рэзалюцыя па дакладу аб пастановах V кангр. Камінт.

Заслухаушы даклад аб пастановах V кангрэсу Камінтэрна, канфэрэнцыя далучаецца да рэшэньня гэтага кангрэса. Канфэрэнцыя лічыць, што становішча у розных сэкцыях Камінтэрна, як у польскай і нямецкай, ацэнена правідлова і далучаецца да рэзалюцыі па гэтаму пытаньню Камінтэрна.

Канфэр. лічыць неабходным вясьці барацьбу з правымі апартуністычнымі ухіламі, лічыць, што т.т. Варскі, Валецкі і Костшэва неправідлова ацэнівалі становішча у РКП. і недаацэнівалі небясьпекі выступленьня „апазыцыі" т. Троцкага супроць Ц.К.Р.К.П.

Канфэрэецыя лічыць, што тактыка адзінага фронту прывяла да карысных вынікау, будучы ужыта у Польшчы, хоць у некаторых выпадках гэта тактыка была у нашых абставінах ужыта неправідлова, асабліва у часы кракаускага паустаньня, за што нясець адказнасьць увесь Ц.К.К.Р.П.П.

Канфэрэнцыя далучаецца да талкаваньняу, дадзеных V кангрэсу па пытаньню тактыкі адзінага фронту, рабоча-сялянскага ураду, а такжа па нацыянальнаму і сялянскаму пытаньнях.

РЭЗАЛЮЦЫЯ АБ ФОРМАХ РЭВАЛЮЦ. БАРАЦЬБЫ У ЗАХОДНЕЙ БЕЛАРУСІ.

1. Найсільнейшы нацыянальны уціск, які імкнецца задушыць усялякую праяву беларускага нацыянальнага быту;

імкненьне абезьзямеліць беларускае сялянства і засяленьне іх земляу польскімі асаднікамі;

зьдзіраньне невыплатных падаткау з сялянства зруйнованага вайной, якое жывець у страшэннай нэндзы па зямлянках і старых нямецкіх акопах.

Грабежная эксплёатацыя прыродных багацтвау краю і прадажа іх заграпічнаму капіталу і безашчадная эксплёатацыя працоуных мас;

самапраустава польскай адміністрацыі, ужываючай зладзейскія сродкі часоу царскага рэжыму; —

Усё гэта памагло прабуджэньню і узросту рэвалюцыйнага уздыму сялянскіх мас, які у недалёкай будучыне можа выліцца у збройнае паустаньне супроць улады ненавісных акупантау.

2. Камуністычная партыя Зах. Беларусі становіцца на чале сялянскіх мас, змагаючыхся супроць улады ненавісных акупантау.

Задачай камуніст. партыі зьяуляецца уцягіваньне як мага больш шырокія масы, арганізацыйна завалодаць гэтым стройным рухам і аб'еднаць яго каля ясных і зразумелых поклічау.

Дзеля падняцьця самых адстаушых і самых пасыуных слаёу сялянства, партыя павінна выкарастаць штодзенныя патрэбы сялянскага жыцьця, павінна бараніць іх інтарэсы у кожнай вобласьці, на кожным кроку, разьвіць непрарыуную штодзённую барацьбу, якая пастаянна бы падрывала акупацыйную уладу і давелабы да узброенага паустаньня да пабеды.

а) Сродкамі, якія вялі-бы да гэтай мэты, зьяуляюцца: несупынная барацьба у вобласьці падаткау, законау аб мове і школе, устаноуленьне зруунованых гаспадарств, барацьба з асадніцтвам і г.д.

У кампаніі байкота падаткау партыя ставіць сабе за мэту: з аднаго боку абарону штодзённых інтарэсау сялянства, а з другога боку максымальнае разьвіцьцё самастойнасьці сялянскіх мас, прабуджэньне вясковых шырэйшых мас, уцягіваць іх у барацьбу, праціпастауленьне іх акупацыйнай уладзе, падрыу і аслабленьне акупацыі, а таксама арганізацыйная і палітычная падгатоука да збройнага паустаньня.

З гэтай мэтай партыя арганізуе сялянскія і гмінныя сходкі, праводзіць пастановы аб байкоце падаткау, прызывае жыхароу да супраціву уладзе пры зборы падаткау, хаваньне маёмасьці, якое можа быць сэквэстэравана, адказы купляць сэквэстэраванае і г.д. У зьвязку з нязьлічонымі падаткамі і іх зьбіраньнем, кампанія байкота падаткау павінна быць пастаянным зьявішчам, дэмаралізуючым улады і арганізуючым масы.

У акцыі супроць закона аб мовах і школах партыя павінна навучыць масы змагацца супроць польскага ураду, карыстаючыся у гэтым выдадзенымі яго законамі. Дзеля гэтага трэба праз гмінныя і сельскія сходы правадзіць пастановы, трэбуючы школ на роднай мове, а такжа вясьці пастаянную і упартую барацьбу за прызнаньне роднай мовы праз дзяржаву.

б) У зьвязку з тым, што польскі урад арганізуе узброеных дабравольцау у Зах. Беларусі, узбраіваючы дзеля гэтага асаднікау, абшарнікау і нацыяналістычныя элемэнты, партыя павінна вясьці пастаянную агітацыю супроць фашыстаускіх адрадау і арганізаваць самаабарону сялянства, адначасна імкнучыся разброіць фашыстау польскіх.

в) Не падтрымліваючы одарваных ад масавага руху актау тэрора і сабатажа, якія могуць скалечыць напрамак барацьбы і павясьці яе па шляху чужому для масавага поступу, творучы грунт для пасыунасьці мас, партыя адначасна павінна найэнэргічней выступаць у абароне беларускіх сялян, якія гібнуць ад даразных судоу і без судоу, і выясьняць, што партызанцкія акцыі ёсьць законны адказ масау на бэзьмежны тэрор і уціск акупантау і што крывавыя польскія суды над так наз. „бандытамі" і „дывэрсантамі" ёсьць расплата акупантау за вынікі іх уласнай палітыкі і правакаваньне новых выступленьняу стыхійнага нездавольства.

г) Неабходным варункам пераможнага паустаньня зьяуляецца расклад арміі, служачай у руках абшарнікау і капіталістау мацнейшым сродкам панаваньня і уціску, і перацягнуць войска на бок змагаючыхся сялян і рабочых. Задача партыі ёсьць вядзеньне самай інтэнсыунай агітацыі сярод арміі, тлумачэньне польскаму, украінскаму і беларускаму рабочаму і сяляніну, пераапранутым у ваенныя вопраткі, што іх абавязкам зьяуляецца ужыць аружжа на кліч кампартыі супроць эксплёататароу, а не супроць братоу.

д) Адначасна партыя падчырківае свае адмоуныя адносіны да байкоту польскай арміі з боку беларускай прызыунай моладзі, прызнаючы, што апошнія павінны ісьці у армію, унясьці туды свой рэвалюцыйны дух і гатавацца да збройнай абароны правоу працоунага чалавецтва.

е) Патрыя імкнецца найцясьней зьвязаць рэвалюцыйны рух сялян з рухам рабочых па гарадох, раскідаць перагародкі, якія да гэтага часу дзелюць гэтыя дзьве рэвалюцыйныя сілы і такім чынам даць рэвалюцыйнаму руху у Зах. Беларусі моцны пралетарскі асяродак. Партыя такжа хоча уцягнуць у рух і польскіх рабочых, разьбіваючы іх ідэалёгію дзяржаунай нацыі; з другога боку хоча разбудзіць сярод белар. народных мас пачуцьцё салідарнасьці да польскіх рабочых і сялян, уносючы у іх рух міжнародны клясовы дух.

ж) II канф. кампартыі Зах. Беларусі падчырківае, што палітычнае становішча і стан рэвалюцыйнага руху у Зах. Беларусі і у зьвязку з гэтым пастановы канфэрэнцыі патрабуюць у далейшым энэргічнай дзейнасьці з боку усёй партыі, якая-б старалася пашырыць чуткі аб змаганьні беларускага народу сярод польскага працоунага народу і забясьпечыла-б паднявольным народам актыуную помач у іх барацьбе супроць польскай буржуазеі за канчатковае задаваленьне усіх іх эканамічных і нацыянальных дамаганьняу.

Канфэрэнцыя прызнае неабходным супольную дзейнасьць К.П.З.Б. з К.П.З.У. у зьвязку з тым, што бадай аднаковыя варункі працы і задачы, якія стаяць перад імі, патрабуюць аднаковых тактычных поступау.

Рэзалюцыя аб злучэньні Зах. Беларусі з Б. С. С. Р.

Польскі імпэрыялізм у барацьбе з Саюзам Сацыялістычных Савецкіх Рэспублік захапіу землі Зах. Беларусі і задушыу рэвалюцыю на яе абшарах. З гэтага часу польскі урад пануе на беларускіх землях як абаронца абшарнікау-пьявак, адначасна уціскаючы мільённыя сялянскія масы, якія з прадвеку зьліваюць потам гэтыя землі.

Беларускі селянін і далей зыкідаецца са сваіх зямель. На землях аграбленых ад белар. селяніна у часе вайны, ці распарцэляваных згодня т. наз. зямельнай рэформы, улада акупантау насаджывае асаднікау, якія служаць апорай для панаваньня абшарнікау. Беларускія землі запалонены разбэшчанай паліцыяй, якая зьдзекуецца над працоуным народам.

Укараняючы гвалтам польскасьць на захопленых белар. землях, польскі урад зьніштажае беларускую культуру, забараняе карыстацца матчынай мовай у школах, судах і установах.

Каб прыкрыць сваю унутраную палітыку гвалтау над нацыянальнымі меншасьцямі перад сьветам, польскі урад правёу праз сойм нікудышныя школьныя і языковыя уставы, якія ня толькі не палепшылі становішча беларускага народу, але яшчэ больш усілілі нацыянальны уціск.

Як вынік гэтай палітыкі ураду акупантау зьяуляецца стыхійны рэвалюцыйны рух сялянскіх мас Зах. Беларусі супроць панскай навалы. Польскі урад на гэты рух адказвае дзікім гвалтам і паняверай. Польскі урад зьмілітарызавау цывільную адміністрацыю і аддау яе пад неабмежавае верхаводзтва генералваеводау, уводзючы гэтым ваеннае палажэньне, пасьля т. наз. крэсы заліу самавольнай паліцыяй, устанавіу згубныя дарэзныя суды і нішчыць народ карацельнымі налётамі войска і паліцыі.

Працоуны беларускі народ ніколі не пакіне змагацца за сваю зямлю і волю. Ён пойдзе следам за сваімі братамі з Беларускай Савецкай Рэспублікі, якія супольна з расейскімі сялянамі і рабочымі прагналі абшарнікау і капіталістау, а усю зямлю зрабілі уласнасьцяй тых, кто на ёй працуе.

Сяляне Зах. Беларусі будуць змагацца за адарваньне сваіх зямель ад буржуазнай польскай дзяржавы і прылучэньне іх да Беларускай Сав. Рэспублікі.

Усялякія клічы як аутаномія і іншыя высунутыя ці то праз т. наз. польскую дэмакрацыю, што знаходзіцца на услугах польскага імпэрыялізму (сацыялздрайцы П.П.С. і Вызваленьне), ці то праз беларускіх згоднікау, якіх утрымлівае польская дэфэнзыва — усе яны маюць на мэце адвясьці беларускія сялянскія масы ад рэвалюцыйнай барацьбы за зямлю і нацыянальнае вызваленьне, каб гэтым ашуканчым і здрадным подступам утрымаць Зах. Беларусь пад уладай польскіх акупантау у імя абшарніцкіх інтарэсау. Партыя павінна вельмі энэргічна змагацца з імі.

У сваім імкненьні да зямлі і волі беларускія сяляне салідарны з рэвалюцыйным рухам рабочых і сялян усей Польшчы і бачаць у польскай рэвалюцыі выхад для зьдзейсьненьня сваіх сацыяльных і нацыянальных мэт, а у К.П.П. — саюзьніка у супольнай барацьбе беларускага і польскага народу за Савецкую уладу, за адабраньне абшарніцкай зямлі, за вызваленьне падняволяных нацыянальнасьцей!

Няхай жыве злучаная Савецкая Беларусь!

Няхай жыве Польская Савецкая Рэспубліка!

АТАМАН МУХА.

(На матыу: „Стенька Разін").

Польскі бот неміласэрна
Топча край беларусоу.
Грабіць, муча пан бязьмерна —
Ня было такіх часоу.

Стогнуць вёскі ад падаткау,
Пухне з голаду народ,
Лад вядзе бізун і узятка,
Патурае розны зброд.

Вось на помсту за няволю,
За грабежствы і за зьдзек —
Стау на кліч народнай волі
Беднай вёскі чалавек.

Ён пагібель ліхадзееу,
Гэта Муха атаман.
Перад ім са страху млее
Ксёндз-груган, пузаты пан.

Горы золата з палацау,
Муха скажа, дых плыве,
Скуль узята, там дзе праца
У курнай хатачцы жыве.

Дзмухане са злосьці Муха —
Мігам зьнікне панскі двор.
Кулаком імпэтна бухне—
Ляжа ворагау бугор.

Мухі моц не пераможна,
Бо пакрыуджаныя з ім.
Нават Польшча вельміможна
Пяратрусіла зусім.

Лес і поле, горы, долы
Атамана берагуць.
Беларусі вёскі, сёлы
Пад яго крыло ільнуць.

Скалыхнуу народ да бою
Муха слауны атаман,
Прападай-жа з галавою,
Акупант наш, польскі пан!

ЖЫЦЬЦЁ ПАРТЫІ.

Берасьцейскі вокруг.

З пункту гледжаньня пастановау V кангрэсу Камінтэрна аб бальшавізацыі партыі—мы прыступілі да перагляду нашае арганізацыі і нашае працы.

Малая сьвядомасьць сяброу, адсутнасьць дысьцipліны, канспірацыі, тыпічная для мястэчак „сямейнасьць" ва усіх партыйных справах, а глаунае — брак цьвёрдага кірауніцтва —вось усе хібы нашае арганізацыі. Само сабою вінават тут троха і Ц.К., які нясе палітычную адпавядальнасьць за выхаваньне кадрау у бальшавіцкам духу, — але было-б памылкаю апраудаць мясцовы камітэт. Глауная яго віна у тым, што ён не выконвау самых элемэнтарных сваіх абавязкау, не раагавау на нарушэньне партыйнай дысьцыпліны і г. д.

Мясцовы берасьцейскі камітэт нясе усю адпаведнасьць за працу. Цяпер мы прыступілі да рашучых крокау па аздараленьню арганізацыі. Усіх пасыуных, абмешчаніушыхся, недысцыплінаваных сяброу выключылі з арганізацыі. Уся партыйная праца рэарганізавана на началах дысьцыпліны і канспірацыі. Вядзецца рашучая барацьба з кумауством і „сямейнасьцю".

Нядауна была склікана гарадзькая канфэрэнцыя, каторая выбрала новы, больш работаспасобны камітэт.

Акружная жыдоуская канфер.

У канцы кастрычніка тутака адбылася акружная канфэрэнцыя жыдоускіх працоунікоу, на якой былі прадстаулены усе местачковыя арганізацыі.

На павестку дня былі пастаулены пытаньні: 1) V кангрэс Камінтэрна, 2) Палітычная справаздача Ц.К.К.П.З.Б. і цэнтральнага жыдоускага бюро, 3) Адчот з мест. 4) Арганізацыйныя пытаньні, 5) Выбары, 6) Бягучыя справы.

Прадстаунікі местэчак указалі на рэвалюцыйнае бражэньне на вёсцы, каторае рвецца да барацьбы і патрабуе выступленьня. Што касаецца жыдоускага насяленьня, то яно больш адсталае, менш пранікнута ідэей аружнага паустаньня, якую вядзе беларускі работнік і селянін.

Па гэтаму пытаньню, а так сама па пытаньню аб нашай тактыцы сярод жыдоускай беднаты вялася шырокая дыскусія, вынікам якое была прынята асобая рэзалюцыя, у якой адзначаецца патрэбнасьць вясьці энэргічную працу сярод жыдоускага пралетарыята з мэтаю уцягнуць яго у рэвалюцыйную барацьбу беларускіх рабочых і сялян.

Па пытаньню аб жыдоускіх народных школах канфэрэнцыя пастанавіла вясьці рашучую барацьбу з бундауска-мяшчанскай школьнай радай і працівапаставіць ёй свае пралетарскія школы апіраючыяся на прафсаюзах і засноуваць дзе можна такія школы.

Горадзенскі вокруг.

У серадзіне лістапада адбылася акружная канфэрэнцыя жыдоускай сэкцыі пры кампартыі Зах. Беларусі. На канфэрэнцыі выяснілася, што Горадзен. вокруг налічае да 300 таварышау жыдоу. Згодна апошняй дэкларацыі Ц.К.К.Р.П.П. пастаноулена рашуча прыступіць да абальшавізаваньня партыі. Баявым клічам прызнана байкот падаткау і адказ ад пакупкі рэквізаваных сялянскіх рэчау за неаплааныя падаткі.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

З ПІНСКАГА ВОКРУГУ.

— **Кампанія дапамогі палітычным арыштаваным.** У Домбровіцах кампанія пачалася тым, што былі вывешаны 2 чырвоныя сьцягі—адзін на будынку почты, другі на мосьце. Сьцены, тэлэграфныя слупы, будынкі на чыгунцы — усюды былі напісаны лёзунгі, усюды была расклеена і раскідана літэратура.

Ня менш энэргічна пачалі кампанію акружаючыя Домбравіцы вёскі. На вёсцы Кольпі Лютаускай валасьці, на вёсках Орвятіце, Куроме, Саломеннай усюды развешаны чырвоныя сьцягі і раскідана літэратура. У Куроме чырвоны сьцяг вісеу два дні.

Уражаньне — велькае. Уся люднасьць была устрывожана. Адміністрацыя і паліцыя перапалошылася. Яна была пэуна у тым, што гэта пачалося паустаньне. Зьбіралася уцякаць. З Сарны былі вызваны па тэлефону жаунеры, услед за якімі быу высланы спецыальны курьер, каторы павінен быу данесьці, ці не перашлі яны часам на бок паустаушых. У хуткім часе выясьнілася аднак, што паустаньня няма і да паліцыі ізноу вярнулася „храбрасьць".

Тым часам з Сарны былі пасланы 20 агентау дэфэнзывы— але з тым жа цягнікам ехалі нашы сябры, якія раскідалі на станцыях нашу літэратуру. Цягнік затрымалі, правялі вобыск у пасажырау і затрымалі семярых. Таго ж дня у Дамбравіцах адбывалася паляваньне на людзей. Лавілі усіх устрэчных на вуліцы. Было арыштавана 200 чалавек і зроблена каля 100 вобыскау. Сярод арыштаваных былі нават і дзеці 10 гадоу. Арыштаваных білі да паусьмерці. Білі і на вуліцах, і у хатах, і на пастарунку. Некаторым падсунулі адозвы і абвінавачваюць у здрадзе стану. З пастрадаушых пакуль што вядома фамілія Вольфа Слуцкага і яго сястры.

— **Байкот падаткау.** Ня менш энэргічна у Дамбравіцкім районе ідзе і байкот падаткау. Пад уплывам нашых лёзунгау на сходах сяляне пастанавілі нічога не плаціць.

Падатковая улада заключыла дагавор з 7 купцамі, каб яны скупілі канфіскованыя рэчы. Купцоу прывязлі у Дамбровіцы і рэквізыцыя пайшла „гладко", усё забранае адразу перадавалася купцам. Гэтым купцам цяпер прыдзецца горача, бо сяляне пакляліся ім мсьціць.

— **Падатак за 1918 год.** У вёсцы Откоппіцах налажылі падатак на сялян за тое, што пасьвілі сваю скаціну за часы нямецкае акупацыі.

— **Трывожны настрой.** У Давід-Гарадку і раёне байкот падаткоу абхапіу 15 вёсак аж да самае граніцы. Настрой трывожны. Паліцэйскія у адзіночку не паказваюцца, ходзяць па 5—10 чалавек.

— **Бой сялянау з паліцыяй.** У Лагішыне рух байкоту падаткау абхапіу 10 вёсак. Настрой сялянау трывожны і прыпадняты. Калі у Лагшіыне сабраліся сяляне на сход, каб абгаварыць адозвы камуністау—прыехау атрад паліцыі і кінууся адбіраць адозвы. Разгарэлася настаяшчая бойка. Сяляне адважна біліся з паліцыяй і пабілі яе. Паліцыя прымушана была адступіць у „парадку".

— **Акупанты катуюць беларускіх сялян, ім памагае нават доктар.** Да селяніна Габруся Патрубенкі з вёскі Туры, Хорскай валасьці, Сталінскага пав. зайшоу да хаты паліцэйскі з двума сышчыкамі і солтыс ды сталі рабіць вобыск. У яго куфэрку нашлі кніжку напісаную Керэнскім у 1917 г. і верш Дземьяна Беднага. За гэтую праступнасьць Патрубенка арыштавалі і адправілі у Давід-Гарадок на паліцэйскі пастарунак. Там ад арыштаванага пачалі дамагацца, каб прызнауся у прынадлежнасьці да кампартыі і ад каго атрымау літэратуру (успомні дзе узяу яе у 1917 і 19 годзе!) Зразумела, што ён ня помніу і не прызнауся, што камуніст. У адказ на гэта кіраунік сталін. паветовай дэфэнзывы выпіргнуу арыштаванага у другі пакой і там разам са шпіком Недопытальскім зьбілі яго да безчуцьця. Калі зьбіты ачнууся, яму далі сьцюдзёнай вады і загадалі змыць кроу, (баяліся сьлядоу) і зноу сталі дапытвацца. Патрубенка ня было у чым прызнавацца. Тады у яго сьцягнулі боты, кінулі на нары і Кантаровіч стау біць яго па голых пятках зялезным дручком. Зноу білі да безпамяці, а пасьля скінулі на зямлю, дзе Патрубенка пралежыу усю ноч. А гадз. 11 вечара яму давалі нешта падпісаць, а што, ён ня помніць.

Раніцай яго закавалі і пехатой пагналі у Пінск. Зьбіты, бяз сіл, скатаваны, ён па дарозе папрасіу паліцэйскага Жука, каб той прыкавау яго за другую руку, у адказ на што Жук ударыу яго прыкладам і раніу руку.

Дацягнуушыся да вастрогу, пабіты зьвярнууся да вастрожнага доктара за дапамочай, але той выслухаушы усю прауду ад Патрубенкі, адмовіуся прыняць яго у бальніцу, сказаушы: „гэта нічога, зажывець".

— **За тое, што камуніст— б'юць і за тое, што не камуніст— таксама б'юць.** У м. Давід-Гарадок, Пінск. вокр. да месцовага жыхара беларускага селяніна Сямёна Куста, аб 11 гадзіне ноччу да хаты уварваліся кіраунік дэфэнзывы з камандантам паліцэйскага пастарунку Главацкім, перавярнулі усё памешканьне усё нешта шукаючы. Такткі нічога і не нашлі. Аднак гаспадара чамусьці арыштавалі і прывялі на пастарунак. Кіроунік дэфэнзывы Кантаровіч выняу з шуфляды нейкую надрукаваную паперыну і запытау яго, ці знаець ён што гэта. Гэта была лістоука камун. партыі, якую Сямён Куст першы раз пабачыу у руках Кантаровнча, деля таго ён і сказау што ня ведае. Тады кіроунік дэфэнзывы патрэбавау, каб арыштаваны прызнауся што ён камуніст і сказау ад каго ён узяу гэтую лістоуку. Селянін камуністам ня быу і ня ведау нічога аб лістоуцы. Тады Кантаровіч завёу яго у другі пакой і так ударыу Куста у вуха, што той зваліуся без памяці і цяпер дрэнна стау чуць.

Калі арыштаваны ачнууся, дык прышлі да яго камандант пастарунку Главацкі і шпік Сідорын і дамагаліся, каб ён прызнауся у прыналежнасьці да партыі і адкрыу арганізацыю. Селянін гэтага не зрабіу, тады з яго сьцягнулі боты, кінулі на нары і кіроунік дэфэнзывы Кантаровіч пачау біць С. Куста па голых пятах зялезным прутом. Білі да туль, пакуль няшчасны ня вытрымау і дау саглас падпісаць усё што яму загадаюць.

Тады шпік Сідорын падау яму нейкую паперку, якую пабіты ня меу сіл разабраць, але падпісау, каб звольніцца ад катаваньня.

З БЕРЭСЬЦЕЙСКАГА ВОКР.

Дэманстрацыя у Берэсьці на Б. У час будовы дома адзін рабочы зваліуся з рыштаваньня і забіуся да сьмерці. Хаутуры забітага рабочага адбыліся 8.XII. Да тысячы рабочых сяброу прафсаюзау сабралося са сваімі сьцягамі правадзіць забітага таварыша на магілкі. Каля 12 ч. у дзень пры бальніцы сабралася больш тысячы асоб, а у 2 ч. калі хаутурная працэсыя транулася з месца, дык табала павялічылася да пяцёх тысячау.

У часе паходу нашы таварышы выкрыківалі: Няхай жыве Сав. Беларусь! Няхай жыве чырвоная армія! Прэч акупантау! Тысячныя масы падхоплівалі гэтыя поклічы і разлегаліся дружныя ура. Паліцыя ачумела і ня ведала што рабіць. Калі паход прахадзіу міма паліцэйскай управы нехта крыкнуу далоу паліцыю! далоу дэфэнзыву! у адказ на гэта загрымела тое-ж дружнае „ура". Тут ужо паліцыя, якая стаяла пры паліцэйскай управе, завалтузілася. Нашы таварышы пачалі пець „Інтэрнацыянал", рабочыя падхвацілі і толька бундауцы іспужаліся рабочага гімна і пачалі уцекаць на тратуары.

Так з пяянем рэвалюцыйных песянь дайшлі да магілак, дзе пасыпаліся прамовы. Пахаутурыушы таварыша з рэвалюцыйнымі песьнямі дэманстранты разышліся дамоу.

— **Байкот падаткау.** У вёсках Смаляніца, Хорево, Лукі і Ганчыцы Пружанскага павету сяляне саусім ня плацяць падаткау. Калі паліцыя са зборшчыкамі прыходзіць канфіскаваць дабро сялянское — ім нічога не даюць.

У вёсцы Смоленіца быу сход, на якім сяляне абгаварвалі пытаньне аб падатках і пастанавілі нічога не даваць. За гэта паліцыя арыштавала солтыса і некулькі сялян. Але сяляне дружно абаранілі сваіх людзей і, памяу бакі паліцыі, адбілі арыштаваных.

З ГОРАДЗЕНСКАГА ВОКР.

Абвешчаная акцыя помачы пал. вязьням вызвала моцныя рэпрэсыі з боку паліцыі. Неаслабна ішла сьлежка, адбываліся вобыскі і нават было арыштована да дзесятку асоб абвінавачаных у камунізме. Для праведзеньня акцыі была абрана асобная камісыя. Праца велася у трох напрамках: палітычным, матарьяльнай дапамогі і прапаганды. Прапаганда, якая мела выражацца у мітынгах, рэфэратах і інш. не удалася, бо сабраньня было паліцыяй разогнана і пароблены вобыскі па кватэрах. Зразумела, што без належнай прапаганды не магло быць сабрана шмат ахвяр, аднак да 500 зл. усёткі здалелі сабраць, хоць аканчальны падрахунак яшчэ ня зроблены. На заканчэньне акцыі шаблонамі пароблены клічы на сьценах, завешаны на тэлеграфных дротах сьцягі і раскідана адпаведная літэратура. Усё гэта ускалыхнула і зацікавіла Горадзенскіх рабочых, асабліва шмат шуму нарабіу выкінуты сьцяг з беларускім надпісам. Рабочыя пачулі, што ёсьць белар. кам. арганізацыя і бачаць у гэтым сваё хуткае вызваленьне і далучэньне да Сав. Беларусі.

З БАРАНАВІЦКАГА ВОКР.

— **Усё за аднаго.** У вёсцы Бутыні Слонімскага пав., паліцыя, шукаючы учаснікау нападу на цягнік пад ст. Лесная арыштавала двух нявінных сялян. Уся вёска паднялася на абарону арыштаваных і усе падалі заяву у акружны суд, у якім яны сьведчуць аб нявіноунасьці арыштаваных.

Паны-акупанты, якія сядзяць у акружным судзе, не прынялі заявы сялян.

Відаць, што акупантау словам няймеш—супроць іх патрэбна ёмкая дубіна.

— **Акупанты— вастрожнікі.** У Слонімскім вастрозе чакаючы надзвычайнага суда сядзяць дзесяткі беларускіх сялян, якіх паліцыя арыштавала абвінавачваючы іх у нападзе на цягнік пад ст. Лясной. Паліцыянтам-душагубам усё роуна, што гэтыя сяляне аб нападзе на цягнік даведаліся толькі у вастрозе.

Генарал-ваяводзе патрэбна знайсьці „вінаватых" ну вось рупная паліцыя і найшла.

У гэтым вастрозе заведзена ваеннае палаженьне. Там над усім верхаводзіць ваенны камандант, які не дазваляе вязьням бачыцца са сваякамі.

Мала гэтага. Сем'і заключоных прыезджаюць з далёкіх вёсак прывозючы харчы для сваякоу, але камандант загадау не прынімаць і арыштаваныя увесь час галадуюць.

ВІЛЬНЯ. ДРУКАРНЯ КАМУНІСТЫЧНАЕ ПАРТЫІ ЗАХОДНЕЙ БЕЛАРУСІ.